Наталля Шашэнька

# Да юбілею бюлетэня «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку»



Галоўны бібліёграф
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі




У чэрвені 2020 г. споўнілася 60 гадоў штомесячнаму бібліяграфічнаму бюлетэню «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку», што выдаецца навукова-даследчым аддзелам бібліяграфіі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. За гады свайго існавання дапаможнік набыў шырокую папулярнасць у бібліятэк краіны, заваяваў пэўны аўтарытэт за межамі Беларусі, стаў адным з вядомых беларускіх бібліяграфічных выданняў.

Гісторыя бюлетэня пачынаецца ў 1950-я гг., якія адзначаны павышэннем увагі да спецыяльнай бібліяграфіі Беларусі, актывізацыяй работы па стварэнні рэспубліканскай сістэмы рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў. Дзяржаўнай бібліятэцы БССР (ДБ БССР) як рэспубліканскаму метадычнаму цэнтру ў галіне бібліяграфіі пастановай калегіі Камітэта па справах культурна-асветніцкіх устаноў пры Савеце Міністраў БССР (1950) і загадам міністра культуры БССР (1954) было прапанавана прыняць меры па павышэнні якасці рэкамендацыйнай бібліяграфічнай работы. У 1950-х гг. ДБ БССР у сваёй рабоце па рэкамендацыйнай бібліяграфіі распрацоўвала розныя віды і формы выданняў, імкнулася знайсці найбольш эфектыўныя спосабы адбору літаратуры і распаўсюджвання праз кнігу новых ведаў. У 1954 г. па ініцыятыве першага дырэктара І.Б. Сіманоўскага бібліятэка пачала выпуск рэкамендацыйнага бюлетэня «Новыя кнігі БССР», які ўключаў звесткі аб новых беларускіх кнігах і выданнях цэнтральных выдавецтваў, неабходных раённым, сельскім і калгасным бібліятэкам. Паказальнік праіснаваў да 1956 г. Неабходнасць у ім адпала ў сувязі са з'яўленнем у 1955 г. аналагічнага дапаможніка Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У.І. Леніна і штотыднёвага бюлетэня «Новые книги» Усесаюзнай кніжнай палаты. Выданне паказальніка было адноўлена ў 1958 г. у якасці дадатку да «Летапісу друку БССР». Пасля прыняцця пастановы ЦК КПСС «Аб стане і мерах паляпшэння бібліятэчнай справы ў краіне» (1959) і пастановы ЦК КПБ «Аб мерах па паляпшэнні работы бібліятэк рэспублікі» (1959) стаў паўнавартасным выданнем рэкамендацыйнай бібліяграфіі.

У чэрвені 1960 г. пад кіраўніцтвам І.Б. Сіманоўскага пачалося выданне бібліяграфічнага бюлетэня «Новыя кнігі БССР» як самастойнага дапаможніка, стварэнне якога дазволіла ДБ БССР, абласным і масавым

бібліятэкам рэспублікі адмовіцца ад выпуску малых форм рэкамендацыйнай бібліяграфіі – кароткіх спісаў літаратуры па актуальных пытаннях. Галоўнай задачай паказальніка «Новыя кнігі БССР» з'яўлялася азнаямленне бібліятэчных і кнігагандлёвых работнікаў, а таксама шырокага кола чытачоў з навейшай літаратурай па ўсіх галінах ведаў. Акрамя таго, бюлетэнь павінен быў стаць метадычным дапаможнікам для бібліятэк рэспублікі ў арганізацыі інфармацыйна-метадычнай дзейнасці.

Структура і методыка складання матэрыялаў дазвалялі спалучаць у бюлетэні бягучую і рэкамендацыйную бібліяграфію. Бюлетэнь «Новыя кнігі БССР» складаўся з наступных раздзелаў: раздзел «Кнігі за ... (месяц)», «Рыхтуюцца да выпуску», «Беларуская ССР у друку СССР», «Рэцэнзіі на новыя беларускія выданні, якія атрымалі станоўчую адзнаку», «Памятныя даты», «Хроніка», «Парады бібліятэкару». Важным крытэрыем адбору дакументаў з'яўляўся тыраж: у выданне ўключаліся кнігі, якія выйшлі тыражом больш за 1000 экз. (за выключэннем беларусазнаўчай літаратуры). Бібліяграфічныя запісы ствараліся згодна з дзеючымі ў той час нарматыўнымі дакументамі і сістэматызаваліся ў адпаведнасці з Бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыяй (ББК), што дазваляла бібліятэкарам злучыць гэтыя матэрыялы з сістэматычным каталогам і сістэматычнай картатэкай артыкулаў у мэтах паляпшэння бібліяграфічнага абслугоўвання. На старонках «Новых кніг» друкаваліся і матэрыялы ў дапамогу бібліятэкарам рэспублікі. Штогод у першым нумары бюлетэня змяшчаліся звесткі аб методыцы яго выкарыстання, кансультацыі па бібліяграфічнай рабоце бібліятэк. Раздзел «Парады бібліятэкару» змяшчаў метадычныя матэрыялы па розных пытаннях бібліятэчнай дзейнасці, адказы на запыты і пытанні бібліятэкараў па падрыхтоўцы і правядзенні масавых мерапрыемстваў у бібліятэках розных тыпаў. Акрамя пастаянных раздзелаў на старонках выдання «Новыя кнігі БССР» і ў дадатках да яго публікаваліся рэкамендацыйныя спісы літаратуры па актуальных пытаннях. Даведачны апарат паказальніка змяшчаўся ў кожным 12-м нумары і складаўся з раздзела «Матэрыялы, апублікаваныя ў бюлетэні "Новыя кнігі БССР" у ... годзе», дзе адлюстроўваліся дадаткі да выдання, кароткія спісы літаратуры і матэрыялы да памятных дат.

Згодна з «Палажэннем аб каардынацыі дзейнасці бібліятэк Беларускай ССР у галіне рэкамендацыйнай і навукова-інфармацыйнай бібліяграфіі і даведачна-бібліяграфічнай работы» (1962), пастановай Міністэрства культуры БССР «Аб далейшым развіцці і выкарыстанні рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў рэспубліцы» (1964), Палажэннем аб сістэме дапаможнікаў рэкамендацыйнай бібліяграфіі (1971), Палажэннем аб удзеле бібліятэк Беларускай ССР у стварэнні сістэмы дапаможнікаў рэкамендацыйнай бібліяграфіі (1974) ДБ БССР прызначана каардынацыйным і метадычным цэнтрам у галіне беларускай рэкамендацыйнай бібліяграфіі. У мэтах каардынацыі дзейнасці бібліятэк Беларусі на рэспубліканскай нарадзе па бібліяграфіі (1969), на якой былі падведзены вынікі першага этапу ўсесаюзнага эксперыменту «Эфектыўнасць рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў кіраўніцтве чытаннем», абласным бібліятэкам было прапанавана прыняць актыўны ўдзел у складанні матэрыялаў да памятных і юбілейных дат рэгіянальнага значэння для бюлетэня «Новыя кнігі БССР».

Анкетныя апытанні, праведзеныя ДБ БССР у розныя гады, паказалі, што бюлетэнь «Новыя кнігі БССР» стаў неабходным дапаможнікам для масавых бібліятэк і выкарыстоўваўся пры камплектаванні і дакамплектаванні фондаў, планаванні работы, правядзенні мерапрыемстваў, кіраўніцтве чытаннем, у даведачнай і інфармацыйнай дзейнасці. Структура і змест бюлетэня, а таксама методыка складання матэрыялаў пастаянна ўдасканальваліся ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу, якія падказвала практыка бібліятэчнага абслугоўвання. Павышалася якасць анатацый, павялічвалася колькасць беларусазнаўчых матэрыялаў у календары памятных дат, публікавалася інфармацыя аб новых беларускіх і саюзных бібліяграфічных дапаможніках.

На працягу 30 гадоў змест «Новых кніг БССР» заставаўся амаль без змяненняў, але ў пачатку 1990-х гг. пасля ўтварэння самастойнай Рэспублікі Беларусь тэматыка бюлетэня змянілася: складальнікі бюлетэня звярнуліся да беларусазнаўчай і краязнаўчай тэматыкі. На старонках выдання рабілася спроба зазірнуць у мінулае краіны, асэнсаваць падзеі гісторыі і культурныя набыткі беларускага народа. У гэты час адбыліся змены ў структуры паказальніка, нацэленыя на больш поўнае задавальненне інфарма-

цыйных патрэб карыстальнікаў і аказанне дапамогі масавым бібліятэкам па асноўных напрамках іх дзейнасці, апрабавана методыка спалучэння бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, выдзелены актуальныя рубрыкі ўнутры падраздзелаў. З рэарганізацыяй раздзела «Навінкі беларускага друку» змяніўся і яго змест: у ім знайшлі адлюстраванне не толькі кнігі, але і артыкулы з рэспубліканскіх часопісаў і газет, што было ацэнена даследчыкамі С.В. Зыгмантовіч і В.І. Саітавай як удалае метадычнае рашэнне. У 1991 г. даведачны апарат бюлетэня пашырыўся за кошт уключэння ў яго склад дапаможных паказальнікаў да раздзела «Навінкі беларускага друку» – персанальнага, геаграфічнага і прадметна-тэматычнага (пазней стаў называцца прадметным), што палепшыла пошукавыя якасці выдання. Змены ў структуры, змесце і метадыцы распрацоўкі матэрыялаў пераўтварылі дапаможнік у каштоўную беларусазнаўчую крыніцу інфармацыі. Назва бюлетэня неаднаразова змянялася: з 1992 г. ён называўся «Новыя кнігі Беларусі», а з дзявятага нумара 1995 г. – «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку».

За гады свайго існавання дапаможнік набыў шырокую папулярнасць сярод бібліятэк краіны, стаў адным з лепшых беларускіх бібліяграфічных выданняў. «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» – надзейны памочнік у прафесійнай дзейнасці бібліятэкараў, які дае ўяўленне аб кнігавыданні ў Беларусі, сродкамі бібліяграфіі дапамагае сачыць за зменамі, якія адбываюцца ў грамадстве.

Бюлетэнь складаецца з асноўнай часткі і дадатку, сабраных пад адной вокладкай. Асноўная частка прадстаўлена кнігамі беларускіх выдавецтваў (прыярытэтную групу складаюць навукова-гуманітарныя, навукова-папулярныя), што паступілі ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, найбольш актуальнымі і значнымі артыкуламі з рэспубліканскіх часопісаў (у асноўным дзяржаўных), а таксама рэцэнзіямі на беларускія выданні. Бібліяграфічныя запісы выбарачна дапаўняюцца анатацыямі з акцэнтам на гістарычны перыяд, геаграфічныя назвы або біяграфічныя звесткі. Усе беларусазнаўчыя матэрыялы знаходзяць адлюстраванне ў дапаможных паказальніках – персанальным, геаграфічным і прадметным, якія штогод змяшчаюцца ў апошнім нумары выдання. У якасці дадаткаў друкуюцца бібліяграфічныя спісы або агляды, прысвечаныя значным гістарычным падзеям і актуальным пытанням сучаснага жыцця Беларусі, штогадовы пералік юбілейных дат «Беларускі каляндар, ... год», а таксама матэрыялы да юбілеяў выдатных дзеячаў краіны, шэрага арганізацый і ўстаноў, якія складаюць аснову эканомікі, культуры, навукі і асветы Беларусі.

Некалькі пакаленняў бібліёграфаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ўнеслі ўклад у развіццё дапаможніка, яго змест і методыку складання. Матэрыялы для паказальніка складалі супрацоўнікі розных структурных падраздзяленняў бібліятэкі: навукова-метадычнага і рэдакцыйна-выдавецкага аддзелаў, аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі. З 1961 г. у бібліятэцы быў створаны навукова-бібліяграфічны аддзел, у складзе яго дзейнічала група рэкамендацыйнай бібліяграфіі, якая і ўзначаліла працу над «Новымі кнігамі...». Ля вытокаў выдання стаялі Н.В. Каляда і заслужаны дзеяч культуры Беларусі А.П. Дземчанкава. У першыя гады існавання дапаможніка складаннем бібліяграфічных матэрыялаў займаліся Ф.І. Мільчына, В.Н Дышыневіч, Т.І. Грынкевіч, Р.І. Кулагіна і інш. Шмат гадоў прысвяцілі бюлетэню выдатныя бібліёграфы: М.А. Каваленка, Т.К. Лазарук, З.Л. Елісавецкая, А.В. Мураўёва, К.Д. Варанько, І.В. Нарчук, Т.Я. Мамедава, Г.В. Брага, В.У. Ліхімовіч і інш. Дзякуючы зладжанай працы гэтых высокакваліфікаваных спецыялістаў «Новыя кнігі…» набылі аўтарытэт сярод карыстальнікаў.

Комплекснае раскрыццё значных і актуальных тэм надаюць штомесячнаму ўніверсальнаму бібліяграфічнаму бюлетэню «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» статус добрага дарадцы і нязменнага памочніка для ўсіх катэгорый спажыўцоў, незалежна ад узроўню падрыхтоўкі, узросту, адукацыі, прафесійных і асабістых інтарэсаў карыстальнікаў. Паўната дакументнага патоку, даступнасць для набыцця, наяўнасць цікавых рубрык і даведачнага апарату, надаюць выданню статус каштоўнай беларусазнаўчай крыніцы інфармацыі.

Summary

The article is dedicated to the 60th anniversary of the monthly bibliographic bulletin “New books: on the pages of the Belarusian press”.